Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

9 КРАСАВІКА 2022 г. СУБОТА

№ 69 (29691)

КНІГА ЯК НЕЗВЫЧАЙНЫ ТАВАР 8

«ІДЭАЛЬНЫ ШТОРМ» РАЗГУЛЯЎСЯ ПА ЕЎРОПЕ 10

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Вароты любога прадпрыемства для вас адчыняюцца»

Вароты любога беларускага прадпрыемства будуць адчыняцца для пакістанскіх партнёраў. Пра гэта на сустрэчы з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Пакістана ў Беларусі Саджадам Хайдэрам Ханам заявіў Прэзідэнт Беларусі.

«Калі ў вас ёсць інтарэс да нашай эканомікі, да нашых магчымасцяў, вароты любога прадпрыемства для вас адчыняюцца. Вы заўсёды былі нашым сябрам і, думаю, застаняцеся, нягледзячы на супярэчнасці сучаснага свету», — сказаў Аляксандр Лукашэнка дыпламату.

Кіраўнік краіны абмеркаваў з паслом далейшыя перспектывы супрацоўніцтва Беларусі з Пакістанам, які назваў адной з найбуйнейшых краін планеты. Прэзідэнт акцэнтаваў, што двойчы бываў у Пакістане з афіцыйным візітам і захаваў добрыя адносіны з кіраўніцтвам краіны.

«У нас былі добрыя адносіны і з мінулым урадам, і сённяшнім. Нягледзячы на сітуацыю, што складваецца ў Пакістане, я ўпэўнены: у эліты Пакістана дастаткова розуму, каб у гэты вельмі складаны перыяд захаваць гіганцкую ядзерную дзяржаву», — сцвярджаў Аляксандр Лукашэнка.

Палітычныя праблемы ў Пакістане выкліканыя супрацьстаянне дзеючага прэм'ер-міністра Імрана Хана з апазіцыйнымі сіламі. Яны, арыентаваныя на супрацоўніцтва з заходнееўрапейскімі краінамі, дабіліся расколу ў правячай кааліцыі і жадаюць імпічменту прэм'ера.

Па словах Прэзідэнта, у краін ёсць аснова для супрацоўніцтва. Ужо прапрацоўваецца праект суменснага прадпрыемства па вытворчасці тэхнікі ў Пенджабе.

«Мы гатовы рухацца і далей. Я ўпэўнены, што вы добра ведаеце нашы магчымасці і чым мы можам быць карыснымі Пакістану», — дадаў кіраўнік краіны.

Ён распавёў паслу пазіцыю Беларусі ў дачыненні да канфлікту ва Украіне. «Вы павінны ведаць нашу прынцыповую пазіцыю: Расія з'яўляецца нашым надзейным саюзнікам, мы заўсёды былі і будзем з Расіяй у любой сітуацыі, у любых цяжкасцях і складанасцях», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Пры гэтым ён заявіў, што Беларусь выступае за мірнае ўрэгуляванне канфлікту, не прымае ніякай вайны і плануе здзяйсняцаць у перагаворах аб міры.

«У нас гэта на генетычным узроўні. Мы прайшлі ў сярэдзіне мінулага стагоддзя цяжкія дзесяцігоддзі. Яны нам каштавалі трэці насельніцтва. Таму беларускі народ ніякага канфлікту і супрацьстаяння не прымае. На гэтым грунтуецца наша сённяшняя пазіцыя, якая выяўляецца ў тым, што пытанні, якія абмяркоўваюцца на нейкіх міжнародных пляцоўках, не могуць абмяркоўвацца і рашэнні не могуць быць прынятыя без уліку інтарэсаў беларускага боку, — сказаў Прэзідэнт. — Мы будзем і далей прытрымлівацца гэтай пазіцыі».

У ТЭМУ

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Ісламскай Рэспублікі Пакістан у Беларусі Саджад ХАЙДЭР ХАН заявіў, што Пакістан разглядае Беларусь як сябра і партнёра ў рэгіёне і бачыць значныя магчымасці для супрацоўніцтва.

«Беларусь валодае вялікім вопытам у сферы сельскай гаспадаркі і прамысловасці, таму гэта з'яўляецца ключавой кропкай інтарэсу для Пакістана, у тым ліку ў плане стварэння сумесных прадпрыемстваў на тэрыторыі нашай краіны», — сказаў пасол і паведаміў, што МТЗ ужо праводзіць перагаворы з пакістанскай кампаніяй па адкрыцці зборачнай вытворчасці. На парадку дня, па яго словах, — і шэраг іншых падобных праектаў.

Саджад Хайдэр Хан адзначыў, што тавараабарот краін у 2020 годзе склаў 52 мільёны долараў ЗША, а ўжо летась вырас на 77 працэнтаў.

«Але ў той жа час мы канстатуем, што бягучы тавараабарот даволі нізкі, улічваючы эканамічны патэнцыял дзвюх краін. Мы маем намер прыкласці ўсе намаганні для павышэння тавараабароту ў будучыні. Мы надаём вялікае значэнне актывізацыі кантактаў паміж бізнес-коламі дзвюх краін, у тым ліку дзякуючы ўдзелу ў выстаўках», — падкрэсліў кіраўнік дыпламатычнага прадстаўніцтва.

Па словах Саджада Хайдэра Хана, вялікі інтарэс для Пакістана ўяўляе стварэнне сумесных прадпрыемстваў у сферы перапрацоўкі малака, улічваючы вялікі вопыт Беларусі. Таксама абмяркоўваліся на сустрэчы магчымасці развіцця кантактаў у адукацыі і культуры.

❍ ДАВЕДКА

Тавараабарот паміж Беларуссю і Пакістанам летась склаў 92,6 мільёна долараў ЗША пры станоўчым сальда 63,6 мільёна. Экспарт паслуг — 6,2 мільёна. У студзені 2022 года тавараабарот склаў у памеры 3,46 мільёна. Асноўна экспарту — трактары, запчасткі, калійныя ўгнаенні, малочная прадукцыя, лекі. Імпартуем з Пакістана рыс, цытрусавыя, вырабы са скуры, тканіны і медпрыборы.

Цёплае поле халоднай вясны

Фота Ганны К.

Нягледзячы на неспрыяльнае надвор'е, сяўба яравых ідзе поўным ходам: моцных замаразкаў няма, зямля ўжо адтала. У Асіповіцкім раёне КСУП «Вязаўніца-Агра» на сваіх палях у трыста гектараў, якія падрыхтаваныя на сто працэнтаў, засеяла ўжо тры чвэрці ад запланаванага. На фота: механізатар гаспадаркі Уладзімір МЯЦЕЛЬСКІ.

ЦЫТАТА ДНЯ

Барыс АНДРАСЮК, намеснік міністра аховы здароўя:

«Мы, Міністэрства аховы здароўя, нашы службы, службы дзяржкантролю, Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю сочым і будзем маніторыць цэны. У дзяржаўных установах паслуг, як правіла, засталіся практычна на ранейшым месцы, на некаторыя маглі павысіцца, але толькі на тыя, якія не рэгулююцца. Раней пэўны рост цэн на медпаслугі тлумачыўся ростам валюты. Павышэнне цэн на медыцынскія паслугі закранула, як правіла, прыватны сектар. Яго прадстаўнікі тлумачылі такую сітуацыю ростам курсу долара і павелічэннем долі расходнай часткі — матэрыялаў. Па некаторых пазіцыях, напрыклад, у стаматалогіі, пры аператыўных умяшаннях, на матэрыяльную частку прыпадае ад 70 % да 90 %. Але цяпер валюта пайшла ўніз. Мы за цэнаўтварэннем будзем вельмі жорстка глядзець».

Будаўніцтва

ПОПЫТ НА НОВАЕ ЖЫЛЛЁ ЗАСТАЕЦЦА СТАБІЛЬНЫМ

Пра гэта заявіў намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення будаўніцтва і жыллёвай палітыкі, начальнік упраўлення жыллёвай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Аляксандр АЎРАМЕНКА на прэс-канферэнцыі ў БелТА.

ЗАПЛАНАВАНАЕ БУДЗЕ ПАБУДАВАНА АБАВЯЗКОВА

Па словах Аляксандра Аўраменкі, сёлета на тэрыторыі нашай краіны плануецца пабудаваць 4,2 мільёна квадратных метраў жылля. Пры гэтым 1,2 мільёна «квадратаў» спецыялісты разлічваюць увесці з дзяржаўнай падтрымкай. У нашай краіне дзейнічае шматгадовая практыка па стварэнні ў папярэднім годзе запасу на наступны год. Такі запас складае каля 30 % ад запланаваных аб'ёмаў будаўніцтва. Не стаў выключэннем і мінулы год, што станоўча адбілася на ўводзе ў эксплуатацыю жылля ў студзені — лютым бягучага года. Такім чынам, у краіне за першыя два месяцы года пабудавана 673 тысячы квадратных метраў жылля, што складае больш за 16 % ад гадавога задання. Як бачым, мы будуем нават хутчэй за месячныя планы. З дзяржаўнай падтрымкай за два месяцы пабудавана 217 тысяч квадратных метраў жылля, або 18,1 % гадавога плана, што з'яўляецца ростам на 7,7 % да ўзроўню адпаведнага перыяду мінулага года.

СТАР. 3

Прыёмная кампанія — 2022

НЕ ЎПУСЦІЦЬ СВОЙ ШАНЦ

Пяць дзён, каб паглыбіцца ў студэнцкае жыццё і пераканацца ў правільнасці выбару

«Чаму я хачу стаць «студэнтам БДУ на тыдзень»? Збіраюся паступаць на факультэт журналістыкі, бачу сябе ў гэтай сферы дзейнасці і зраблю ўсё магчымае, каб мая мэта ўвасобілася ў рэчаіснасць. Магчымасць зразумець, як гэта — быць студэнтам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта — патэнцыйна неверагодна каштоўны досвед для мяне. І я хацеў бы атрымаць яго дзякуючы вашаму праекту. Я не баюся выказваць свае думкі і ідзі, ісці насуперак меркаванню большасці, быць у цэнтры ўвагі і задаваць пытанні... І гэта плюс, бо наяўнасць крытычнага мыслення — патрэбная кампетэнцыя не толькі для журналіста, але і для кожнага з нас. Я гатовы прызнаваць і выпраўляць свае памылкі і ніколі не буду настойваць на сваёй пазіцыі, калі мне прывядуць абгрунтаваныя аргументы супраць яе. Я заўсёды стараюся пазбягаць канфліктных сітуацый і зводзіць усё да кампраміса. Аб'ектыўнасць і бескампраміснасць — вельмі каштоўныя рысы характару для кожнага з нас. На мой погляд, гэтых трох пунктаў дастаткова, каб мяне ацаніць. Спадзяюся, вы дасце мне магчымасць паўдзельнічаць у мерапрыемстве і прывязь сябе, — напісаў у сваім матывацыйным эсэ адзінаццацікласнік мінскай гімназіі № 1 імя Ф. Скарыны Аляксей ТУМАРКІН.

СТАР. 3

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Аднаго з верхаводаў якудза арыштавалі ў ЗША пры спробе купіць ракеты

Амерыканскія праваахоўнікі арыштавалі аднаго з верхаводаў найбуйнейшай у Японіі арганізаванай злачыннай групоўкі якудза, які спрабаваў набыць ракеты, скрадзеныя на ваеннай базе ЗША ў Афганістане. Аб гэтым паведаміла пракуратура паўднёвай акругі Нью-Ёрка. Паводле даных абвінаваўцаў, 57-гадовы Такеші Эбісава знаходзіцца ў поле зроку супрацоўнікаў Управлення па барацьбе з наркотыкамі ЗША (DEA) з 2019 года. Яго арыштавалі ў Нью-Ёрку, у рамках гэтай справы таксама затрыманы трое грамадзян Тайланда. У якасці аплаты за зброю Эбісава плануе завезці ў ЗША не менш за тону наркотыкаў для іх рэалізацыі на вуліцах Нью-Ёрка і іншых гарадоў. Набытыя ракеты класа «зямля-паветра» ён планаваў перадаць баевікам з этнічных узброеных груповак, якія дзейнічаюць у М'янме. Газета New York Daily News паведамляе, што апроч ракет у партыі зброі, прызначаній для паўстанцаў, фігуравала больш за 70 рэактыўных танкавых гранатамётаў і дзесяць кулямётаў М-60.

У Славакіі ўкраінскіх бежанцаў просяць вызваліць гасцініцы з-за пачатку турыстычнага сезона

Пра гэта расказаў старшыня самакіравання Банскабыстрыцкага краю Ян Лунтэр, паведаміла славацкая газета Pravda. Па яго словах, у Славакіі з'явілася праблема з турыстычнымі аб'ектамі, якія прынялі бежанцаў. Іх уладальнікі заяўляюць, што набліжаецца летні сезон і ім трэба зарабляць грошы. Менавіта таму атэльеры ўжо абвясцілі шматлікім украінцам, што з мая ім варта шукаць для сябе іншае жыллё. Цяпер у Банскабыстрыцкім краі пражываюць чатыры тысячы ўкраінцаў. З іх каля 35 працэнтаў размешчаны ў прыватных домаўладаннях, яшчэ 10 працэнтаў — у турыстычных аб'ектах. Мясцовыя ўлады адзначаюць, што праз пару месяцаў можа скласціся сітуацыя, калі многія жыхары не змогуць ці не захочуць працягваць размяшчаць у сябе бежанцаў. Таму неабходна комплекснае вырашэнне праблемы з боку дзяржавы. Аднак такой дапамогі пакуль няма.

Сусветныя цэны на прадукты харчавання дасягнулі рэкорднага ўзроўню за ўсю гісторыю

Аб гэтым паведамляецца на афіцыйным сайце Харчовай і сельскагаспадарчай арганізацыі ААН (FAO). Індэкс цэн FAO на прадукты харчавання ў сакавіку склаў 159,3 пункта. Гэта на 12,6 працэнта больш, чым у лютым, калі ён ужо дасягнуў самага высокага ўзроўню з моманту яго стварэння ў 1990 годзе. Цэны на збожжавыя ў сакавіку былі на 17,1 працэнта вышэйшыя, чым у лютым, што абумоўлена значным павышэннем цэн на пшаніцу і ўсё фуражнае зерне ў аснойным з-за падзей ва Украіне. Раслінныя алей, вядучым сусветным экспарцёрам якога з'яўляецца Украіна, падаражэў амаль на чвэрць. Індэкс цэн на цукар вырас на 6,7 % у параўнанні з лютым. Гэта больш як на 20 % вышэй, чым у сакавіку мінулага года. Індэкс цэн на мяса вырас у сакавіку на 4,8 % і дасягнуў рэкорднага высокага ўзроўню, што было абумоўлена падаражэннем свініны.

КАРОТКА

- **Ліцэй МНС правядзе Дзень адкрытых дзвярэй 30 красавіка.**
- Мінадукацыі перагледзіць рэкамендацыі па шостым школьным дні.
- **Больш за 80 выпадкаў хваробы Лайма зарэгістравана ў Беларусі з пачатку года.**
- Дом суменснага пражывання для пажылых і інвалідаў адкрылі ў Жабінцы.
- **Алея свету з'явілася на адналменным праспекце ў Магілёве.**



- Чачэнская Рэспубліка зацікаўлена ў пастаўках беларускага транспарту для пасажырскіх перавозак і дарожнай тэхнікі.
- **У Баранавічах на месцы гібелі лётчыкаў Нічыпорчыка і Куканенкі пачалі ўзводзіць помнік.**

Без тэрміну даўнасці

ТРАГЕДЫЯ НАРОДА РОМА

У Баранавіцкім, Пружанскім, Ляхавіцкім і многіх іншых раёнах краіны фашысты знішчалі цыганскае насельніцтва

Іх схапілі проста ў полі, два табары, забралі ўсіх: мужчын, жанчын, старых, малых, прывезлі ў Міхнаўскі лес, на тэрыторыю Калдычэўскага лагера смерці, і расстралялі. Прыкладна 200 чалавек, дакладна ніхто не ведае. Лагер у Калдычэве Баранавіцкага раёна быў адным з самых жорсткіх канцэнтрацыйных лагераў часоў акупацыі. Усяго тут загінула каля 22 тысяч чалавек розных нацыянальнасцяў.

ПОМНІК З КОЛАМ АД ПАВОЗКІ

Пра трагедыю цыганоў раней асабліва не гаварылі. І помнік ім з'явіўся тут толькі ў 2004 годзе. Яго ўзвяла Беларуская цыганская дыяспара. На месцы расстрэлу ўстанавілі вялікі крыж. Каля яго нацягнулі калючы дрот, на якім прымацавалі кола ад цыганскай павозкі. На крыжы ёсць шыльдачка з надпісам «Тут ляжаць нашы браты-цыганы». На той час гэта быў адзіны помнік цыганам-ахвярам вайны на тэрыторыі краін СНД і Балты.

У Год гістарычнай памяці Баранавіцкая цэнтралізаваная раённая бібліятэчная сістэма наладзіла шэраг экскурсій ў Калдычэўскі лагер.

СТАР. 5

ISSN 1990 - 763X

«Добрыя вынікі, дастойная заработная плата і ўмовы працы»

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА наведала «Акадэмфарм», азнаёмілася з вытворчасцю і правяла сустрэчу з калектывам, падзякаваўшы працоўным за вынікі работы прадпрыемства.

«Сапраўды добрыя вынікі, дастойная заработная плата і ўмовы працы. Але самае галоўнае, што вы сёння тое прадпрыемства, якое займаецца навукай. Пры гэтым, распрацоўваючы новыя віды лекавых прэпаратаў, вы яшчэ і самі займаецеся іх вытворчасцю», — прадае словы Наталлі Качанавай БелТА.

Спікер канстатавала: прадпрыемства займаецца распрацоўкай тых прэпаратаў, якія патрэбны людзям. «Сёння пастаўлена задача кантраляваць і маніторыць цэны. Выпускаць свае фармпрэпараты вельмі важна, таму што яны па цане заўсёды выйграшныя. І, вядома, гэта бяспека нашых грамадзян. Людзі ведаюць, што беларускае — гэта значыць якасць», — дадала кіраўнік Савета Рэспублікі.

Наталля Качанава падчас сустрэчы з калектывам звярнула ўвагу на неабходнасць выдужаць, каб дацы магчымасць развівацца краіне далей. «Мы павінны захаваць наш унутраны стрыжань, па-іншаму не бывае. Калі губляецца гэты стрыжань, мы бачым, што адбываецца з краінамі», — сказала Наталля Качанава.

Спікер верхняй палаты парламента дадала, што сустрэчы з калектывамі праводзяцца, каб дапамагчы чалавеку разабрацца ў плыні інфармацыі. «Мы сустракаемся як мага больш з людзьмі, каб вось так, вочы ў вочы, абмеркаваць усе пытанні. Але трэба разумець галоўнае: вось тая краіна, твой народ, тая зямля, і ты павінен тут рабіць усё, што ад цябе залежыць, каб захаваць мір і спакой, каб развіваць сваю краіну», — расстлумачыла яна.

Год гістарычнай памяці

ДОЎГ КОЖНАЙ ЖАНЧЫНЫ

У Барысаўскім раёне прайшло выязное пасяджэнне прэзідыума Беларускага саюза жанчын на тэму «Захоўваем гістарычную памяць у імя будучыні». Месца правядзення выбралі невыпадкова. Гэты край мае найбагацейшую гісторыю. У гады Вялікай Айчыннай вайны тут дзейнічалі партызанскія атрады і злучэнні, падполле. У гэтым рэгіёне фашысты спалілі 133 вёскі.

Напачатку ўдзельніцы пасяджэння азнаёміліся з прамысловым патэнцыялам Барысаўскага раёна на прыкладзе закрытага акцыянернага таварыства «Белдзвь», наведалі мемарыяльны комплекс вайны 1812 года «Брыльёўскае поле». Побач з барысаўскай сярэдняй школай № 25 пасадзілі «Алею памяці ў гонар жанчын — гераінь Вялікай Айчыннай вайны», пабывалі ў музеі «Ад бацькі да Бацькаўшчыны», які створаны ў гэтай установе адукацыі. Прадстаўніцы Беларускага саюза жанчын папоўнілі экспазіцыю новымі экспанатамі — успамінамі, фотальбомамі ўдзельніц вайны.

Валянціна Пятроўна Баранава з Гродна прайшла ўсю вайну, вызваляла Прагу, брала Берлін. Сёння ёй 98 гадоў, але яна вядзе актыўны лад жыцця, сочыць за модай, іграе на фартэпіяна і акардэоне. Яна сама напісала ўспаміны для музея.

Наталля Якаўлеўна Кучынская была вязнем канцлагера, лячыла народных мсціўцаў у партызанскім атрадзе. Ветэран пражывае ў Бабруйску, выхавала выдатных сыноў, дачакалася ўнукаў. Жанчына працавала на швейнай фабрыцы «Славянка», таму заўсёды старалася, каб яе родныя выглядалі модна, як з іголачкі.

Клаўдзія Рыгораўна Логінава на пачатку Вялікай Айчыннай прасілася на фронт добраахвотнікам, але ў ваенкамаце ёй адмовілі. Павестку дзяўчыне ўручылі, калі ёй споўнілася 19 гадоў. У падмаскоўнай школе яна вывучылася на снайпера, на фронт трапіла ў 1944-м. Пасля вайны жыла ў Чэлябінску, затым пераехала ў Мінск.

Уклад жанчын у Вялікую Перамогу вельмі значны, падкрэслівалі ўдзельніцы пасяджэння. І гэта сапраўды так, 90 з іх атрымалі званне Героя Савецкага Саюза, у тым ліку дзесяць беларусак. Многія змагаліся з ворагам на фронце, у партызанскіх атрадах, падполлі, кавалі перамогу ў тыле на заводах, працавалі на калгасных палях. Пасля заканчэння вайны адналялі гарады, сёлы, народную гаспадарку.

Шмат увагі надаюць гераічнаму мінуламу савецкага народа ў Беларускім саюзе жанчын. На гэтую тэму рэалізуюцца розныя праекты. У прыватнасці, некалькі гадоў ажыццяўляецца праект намесніка старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Ліліі Ананіч «Жаночы твар Перамогі».

«У мінулым годзе да Дня народнага адзінства мы зладзілі вялікае свята, — падкрэсліла **старшыня БСЖ Алена БОГДАН**. — Напярэдадні Дня Канстытуцыі правялі сустрэчу з дзецьмі, дзе расказалі аб змяненнях у Асноўны Закон краіны, што былі прыняты на Усенародным рэферэндуме. Падчас акцыі «Маміны пірагі» з начастункамі наведалі вайсковыя часці, фарміраванні, падзялілася матуліным цяплом з тымі, хто стаіць на варце абароны Радзімы. Цяпер рыхтуемся да вялікага рэспубліканскага мерапрыемства — жаночага форуму «Мір у руках жанчыны».

Лілія Ананіч акцэнтавала ўвагу на тэме гістарычнай памяці.

— У мінулым годзе быў прыняты Закон аб генацыдзе беларускага народа. Пад патранатам Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь ва ўсіх рэгіёнах краіны ствараюцца музейныя экспазіцыі, — расказала яна. — Распрацоўваецца электронны рэсурс «Спаленыя вёскі Барысаўскага раёна». Такі электронны фармат — спалучэнне розных ініцыятыў. Я, чым магу, дапамагаю. Лічу, што мы, жанчыны, павінны паглядзець на гэтую тэму ў сваіх раёнах. Мы можам знайсці магчымасць, каб хоць якімі ўмоўнымі знакамі ўвекавечыць памяць аб вёсках, якія проста сцёрты з зямлі.

— Зразумела, што нельга паўсюль уладкаваць мемарыялы, помнікі. Але электронная форма цалкам даступная, дзякуючы ёй тэма генацыду можа стаць вядомай будучым пакаленням. Мы, як дапутаты, будзем падключацца, каб дапамагчы кожнаму наладжваць кантакты з Цэнтральным архівам, дзе захоўваецца інфармацыя аб кожным знішчаным населеным пункце. Гэта сёння вельмі важна, — звярнулася Лілія Ананіч да ўдзельнікаў пасяджэння.

Дэпутат анансавала мерапрыемства, якое будзе прысвечана тэме жанчын на вайне, гістарычнай памяці. Яно адбудзецца 4 мая і рыхтуецца сумесна з архівамузеем літаратуры і мастацтва.

— Самае галоўнае, што мы працягваем абагравать сваім цяплом усіх жанчын-ветэранаў вайны, якія яшчэ сярод нас. Ёсць яны і на Барысаўшчыне, — дадала парламентарый. — Вельмі важна, каб усё, што мы робім, было захавана як у нашым сэрцы, так і ў сэрцах нашых маладых людзей. І мы, як маці, бабулі, сваім прыкладам, разуменнем павінны перадаваць гістарычную памяць моладзі і наступным пакаленням. У кожнай вобласці ў нашых арганізацыях шмат напрацовак у гэтым плане.

У 2022 годзе Мінскай абласной і раённымі арганізацыямі Беларускага саюза жанчын плануецца правесці больш за 700 тэматычных мерапрыемстваў, якія маюць гістарычнае і грамадска-палітычнае значэнне.

— Ужо іх прайшло больш за 100. Напярэдадні рэферэндуму ў Жодзіне быў арганізаваны абласны жаночы форум «Будуем будучыню разам», які стаў вялікай пляцоўкай для абмеркавання абноўленай Канстытуцыі. Жанчыны прынялі самы актыўны ўдзел у мітынгах, прымеркаваных да 33-й гадавіны вываду савецкіх войск з Афганістана, — канстатавала **старшыня Мінскай абласной арганізацыі БСЖ Тамара КРАСОЎСКАЯ**.

— Мы з'яўляемся нашчадкамі народа-пераможцы. Рэха вайны адбіваецца болем не толькі ў сэрцах беларусаў, але і мільённай людзей свету, якія глядзяць на праўду той вайны расплюшчанымі вачыма і разумеюць, што ў нацызму няма нацыянальнасці, і вераць, што зло будзе пакарана. Беларускі саюз жанчын будзе рабіць усё, каб захаваць у тых, хто жыве цяпер, і ў будучых пакаленнях гістарычную памяць, — рэзюмавала Тамара Красоўская.

Таццяна ГЕОРГІЕВА.

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении **13 мая 2022 года** торгов (в форме аукциона) на право размещения средств рекламы на недвижимом имуществе и в подвижном составе, принадлежащем государственному предприятию «Минский метрополитен»

№ предмета торгов и место размещения средства рекламы (согласно схеме)	Вид средства рекламы	Количество и размер средства рекламы	Начальная цена предмета торгов, бел. руб. (с учетом НДС)
1. Станция метро «Фрунзенская», ВБ-1	Лайт-бокс	2,25 м × 1,2 м – 4 ед.	816,00
2. Станция метро «Фрунзенская», ВБ-2	Лайт-бокс	2,25 м × 1,2 м – 2 ед.	194,72
3. Станция метро «Немига», ВБ-1	Лайт-бокс	2,25 м × 1,2 м – 11 ед.	2 141,92
4. Станция метро «Немига», ВБ-2	Лайт-бокс	2,25 м × 1,2 м – 11 ед.	2 141,92
5. Станция метро «Каменная горка», ВБ-2	Лайт-бокс	2,25 м × 1,2 м – 2 ед., 1,2 м × 1,2 м – 1 ед.	3 049,08
6. Станция метро «Академия Наук», ВБ-1	Лайт-бокс	2,25 м × 1,2 м – 3 ед.	604,68
7. Станция метро «Академия Наук», ВБ-2	Лайт-бокс	2,25 м × 1,2 м – 4 ед.	1 167,20
	Рекламный стенд без подсветки	2,0 м × 1,0 м – 2 ед.	
8. Путевые стены станций метро: «Михалово», «Петровщина», «Грушевка», «Малиновка»	Рекламный стенд из самоклеящейся пленки, пластик ПВХ	3,0 м × 2,0 м – 6 ед., 3,0 м × 1,7 м – 8 ед., 3,0 м × 2,0 м – 6 ед., 3,0 м × 2,0 м – 12 ед.	5 048,16
9.Станция метро «Октябрьская» (платформенный зал)	Лайт-бокс	1,2 м × 1,8 м – 1 ед.	603,09
9.Межстанционный подземный пешеходный переход, соединяющий станции «Октябрьская» – «Купаловская»	Лайт-бокс	1,2 м × 1,8 м – 1 ед.	
10.Межстанционный подземный пешеходный переход, соединяющий станции «Октябрьская» – «Купаловская»	Настенная рекламная конструкция из самоклеящейся пленки	96,6 м × 1,5 м – 2 ед.	6 120,58
11. Межстанционный пешеходный переход, соединяющий станции «Вокзальная» – «Площадь Ленина»	Лайт-бокс	2,25 м × 1,2 м – 5 ед.	486,80
12. Межстанционный пешеходный переход, соединяющий станции «Площадь Ленина» – «Вокзальная»	Лайт-бокс	2,25 м × 1,2 м – 2 ед.	194,72
13. Станция метро «Юбилейная Площадь»	Лайт-бокс	2,0 м × 1,0 м – 2 ед.	194,72
14. Межстанционный пешеходный переход, соединяющий станции «Фрунзенская» – «Юбилейная Площадь»	Лайт-бокс	2,25 м × 1,2 м – 4 ед.	389,44
15. Рекламный плакат, размещаемый в информационном кармане SAN 215 мм × 315 мм	Рекламный плакат формата А4 (210 мм × 297 мм)	По первой линии – в 33 составах: каждый 2-й, 4-й вагоны, нижний ряд – 8 ед. (места №№ 8, 12, 16, 20, 22, 24, 26, 28). Итого по 1-й линии: 528 ед.	3 868,34
16. Рекламный плакат, размещаемый в информационном кармане SAN 215 мм × 315 мм		По второй линии – в 30 составах: каждый 1-й, 3-й, 5-й вагоны, нижний ряд – 8 ед. (места №№ 8, 12, 16, 20, 22, 24, 26, 28). Итого по 2-й линии: 720 ед.	5 275,01
17. Рекламный плакат, размещаемый в информационном кармане SAN 435 мм × 145 мм в верхнем поясе салона вагона	Рекламный плакат формата 423 мм × 133 мм	По первой линии – в 33 составах: каждый 1-й, 2-й, 3-й, 4-й, 5-й вагоны – 5 ед. (места №№ 51, 52, 53, 56, 60). Итого по 1-й линии – 825 ед. По второй линии – в 30 составах: каждый 1-й, 2-й, 3-й, 4-й, 5-й вагоны – 5 ед. (места №№ 51, 52, 53, 56, 60). Итого по 2-й линии – 750 ед. ВСЕГО: 1 575 ед.	3 830,40
18. Рекламный плакат, размещаемый в информационном кармане SAN 435 мм × 145 мм в верхнем поясе салона вагона		По первой линии – в 33 составах: каждый 1-й, 2-й, 3-й, 4-й, 5-й вагоны – 5 ед. (места №№ 61, 71, 72, 73, 74). Итого по 1-й линии – 825 ед. По второй линии – в 30 составах: каждый 1-й, 2-й, 3-й, 4-й, 5-й вагоны – 5 ед. (места №№ 61, 71, 72, 73, 74). Итого по 2-й линии – 750 ед. ВСЕГО: 1 575 ед.	3 830,40

Срок действия договора: по предметам торгов № 1, 2, 3, 4, 5, 6, 7, 8, 11, 12, 13, 14 – с 21 июня 2022 года по 20 июня 2027 года; по предмету торгов № 9 – с 11 июля 2022 года по 10 июля 2027 года; по предмету торгов № 10 – с 9 августа 2022 года по 8 августа 2025 года; по предметам торгов № 15, 16, 17, 18 – с 1 июня 2022 года по 31 мая 2025 года.

Материал изготовления средства рекламы: по предметам торгов №№ 1, 2, 3, 4, 5, 6, 7, 9, 11, 12, 13, 14 – алюминиевый профиль, светодиодная лента, рассеивающая материал, защитное оргстекло; по предмету торгов № 7 – алюминиевая рамка, лист ПВХ, самоклеящаяся пленка; по предмету торгов № 8 – алюминиевый профиль, пластик ПВХ – 3 мм, самоклеящаяся пленка; по предмету торгов № 10 – самоклеящаяся пленка с уменьшенным прозрачным клеевым слоем с нанесенным рекламным сюжетом; по предметам торгов № 15, 16, 17, 18 – немелованная листовая бумага без покрытия плотностью 150-170 г/м².

Организатор торгов – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10, тел. (017) 360-42-22. **Государственное юридическое лицо** – коммунальное транспортное унитарное предприятие «Минский метрополитен», г. Минск, пр-т Независимости, 6, тел. (017) 383-83-60.

Торги проводятся в соответствии с Положением о порядке проведения торгов на право размещения средств рекламы на недвижимом имуществе, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 07.07.2021 № 395 «О мерах по реализации Закона Республики Беларусь «Об изменении законов по вопросам рекламы».

Аукционные торги проводятся **13 мая 2022 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Карла Маркса, 39, зал аукционов (каб. 7). Документы на участие в торгах принимаются с 11.04.2022 по 06.05.2022 включительно в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 6. Документы, поданные по истечении указанного срока, не рассматриваются. Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представленных для участия в торгах, несут лица, их подавшие.

Порядок оформления участия в торгах: к участию в аукционных торгах допускаются лица, прошедшие заключительную регистрацию, которые в срок, установленный для приема документов на участие в аукционных торгах, внесли задаток (задатки) и заключили с организатором торгов соглашение установленной формы о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения торгов по соответствующему их предмету (далее – соглашение), а также представили организатору торгов следующие документы:

- заявление на участие в торгах;

- заверенную банком копию платежного документа о внесении суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет организатора торгов (в случае участия в торгах по нескольким предметам торгов задаток вносится по каждому из предметов торгов).

- копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, желающих принять участие в торгах.

Сумма задатка (сумма задатка соответствует начальной цене предмета торгов) должна быть внесена по соответствующему предмету торгов не позднее окончания срока и времени, установленных для приема документов, на расчетный счет организатора торгов BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, (назначение платежа – задаток для участия 13.05.2022 в торгах на право заключения договора на размещение средств рекламы по предмету торгов №_). Участнику, не ставшему победителем торгов (лицом, приравненным к победителю торгов), внесенный задаток (задатки) возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

При подаче организатору торгов документов для участия в торгах и заключении соглашения предъявляются: физическим лицом, в том числе индивидуальным предпринимателем, – документ, удостоверяющий личность, представителем физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица – оригинал документа, подтверждающего его полномочия, и документ, удостоверяющий личность.

Лицу, допущенному к участию в аукционных торгах, организатор торгов выдает билет участника торгов, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Перед началом торгов организатор торгов проводит заключительную регистрацию лиц, допущенных к участию в торгах. Заключительная регистрация представляет собой замену билетов участников торгов на аукционные номера, под которыми участники торгов будут участвовать в торгах. После проведения торгов участники обязаны вернуть эти номера организатору торгов.

Порядок определения победителя торгов: торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Не допускается продажа предмета торгов по начальной цене. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона, который определяется аукционистом в пределах от 5 до 15 процентов от предыдущей названной аукционистом цены.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов. Если заявление на участие в торгах подано только одним участником, либо для участия в нем явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, а такой участник признается лицом, приравненным к победителю торгов.

Иные условия торгов:

Победитель торгов (приравненное к нему лицо) обязан:

- в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов возместить государственному предприятию «МГЦН» затраты на организацию и проведение торгов, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для их проведения. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом торгов под подпись;

- в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов перечислить на расчетный счет государственного предприятия «Минский метрополитен» сумму средств, за которую продан предмет торгов за вычетом внесенной суммы задатка (цена продажи предмета торгов – стоимость услуг государственного предприятия «Минский метрополитен» по размещению рекламы, определенная по итогам торгов и уплачиваемая ежемесячно в соответствии с условиями торгов и договором на размещение средств рекламы);

- в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов заключить договор об оказании услуг по размещению рекламы с государственным предприятием «Минский метрополитен» (при условии внесения платы за предмет торгов и возмещения организатору торгов расходов на их организацию и проведение).

Размер штрафа, уплачиваемого участником торгов и (или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет 99 (девяносто девять) базовых величин на дату проведения торгов.

Телефоны для справок: отдел аукционов – (017) 360-42-22, рекламно-информационный отдел Минского метрополитена – (017) 383-83-60.

Извещение о проведении торгов размещено на сайтах: организатора торгов – **www.mgcn.by** (раздел «АУКЦИОНЫ/Рекламные конструкции»); государственного предприятия «Минский метрополитен» – **www.metropoliten.by**, Минского городского исполнительного комитета – **www.minsk.gov.by** (раздел «Объявления – Аукционы»).

ОАО «Гомельобрреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин (продавец имущества) извещает о проведении 20 апреля 2022 года открытого повторного аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб.	Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб.
	Условие продажи для лотов №№ 2, 3: После проведения аукциона Продавец уполномочивает покупателя в установленном законодательством порядке обратиться за осуществлением **необходимых действий, направленных на выделение и регистрацию земельных участков**, необходимых для обслуживания предметов аукциона, а также проведение государственной регистрации договора купли-продажи. Покупатель осуществляет регистрационные действия по выделению земельного участка в границах, определенных специализированными службами, согласованными с продавцом. Расходы по приведению в надлежащий вид всей необходимой документации, оформлению земельного участка возлагаются на Покупателя (предварительная схема пользования земельного участка под объекты продаж прилагается). **Информация о земельном участке:** лоты №№ 2, 3 расположены на земельном участке с кадастровым номером **321850100003004080** общей площадью **0,6257 га** – для обслуживания гаража на восемь транспортных единиц, гаража на пять транспортных единиц с диспетчерской (земельный участок для размещения автостоянок и гаражей). **Право постоянного пользования (доля в праве 1/1). Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/9		
1	**Изолированное помещение с инв. № 320/D-34623**, площадью **35 167,2 кв. м**, назначение – производственное помещение, наименование – **изолированное помещение № 15**. **Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/1-15. **Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **340800000003000135** общей площадью **17,582 га** – для обслуживания зданий и сооружений меховой фабрики (для размещения объектов промышленности). **Право аренды (доля в праве 241/250). Доля права на земельный участок будет выделена после регистрации изолированного помещения № 15. Адрес (местоположение):** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/1. **Капитальное строение с инв. № 320/C-38054** общей площадью **9,8 кв. м**, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – **домик дежурного (инв. № 110-0020). Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/23. **Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **321850100001004544** общей площадью **0,0024 га** – для строительства и обслуживания домика дежурного (для размещения объектов неустановленного назначения). **Право постоянного пользования (доля в праве 1/1). Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/23, участок № 1. **Капитальное строение с инв. № 320/C-38827** общей площадью **2 034,2 кв. м**, назначение – сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства, наименование – **участок автодорог для обслуживания помещений ГПК. Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2, территория ОАО «Белфа» г. Жлобин. **Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **321850100003009674** общей площадью **0,6752 га** – для строительства и обслуживания автодорог промышленной площадки (для размещения объектов автомобильного транспорта). **Право аренды. Адрес (местоположение):** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/1 (земельный участок № 2). **Капитальное строение с инв. № 320/C-14646** общей площадью (протяженностью) **19,2 кв. м**, назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **одноэтажное кирпичное здание навесной станции по перекачке 45 куб. м воды в час. Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/1 (земельный участок № 2). **В состав лота входит:** насос СЖ-45/30 (инв. № 142-42633), насос СЖ-160/45 (инв. № 142-42753), бетонный забор (инв. № 120-2096-1), ограждение промплощадки (инв. № 120-2019-5), металлические ворота п.10 5.5х2 (инв. № 120-0020), кран консольный (инв. № 150-52272), электротельфер (инв. № 142-42998), подъемник грузовой технологический (инв. № 142-42294), лифт грузовой г/п 500 кг (инв. № 150-52420), кран-балка, г/п до 1 т (инв. № 150-5237); (инв. № 150-52390); (инв. № 150-52400); (инв. № 150-52380), индивидуальный тепловой пункт № 1 для приготовления ГВС с прибором автоматического регулирования (инв. № 143-5050), центральный кондиционер КТ-30 (инв. № 142-4816), распределительный пункт ЩО-64 (инв. № 141-4377); (инв. № 141-4379); (инв. № 141-4381), (инв. № 141-4311); (инв. № 141-4314); (инв. № 141-4322); (инв. № 141-4323); (инв. № 141-4324); (инв. № 141-4325); (инв. № 141-4326); (инв. № 141-4328); (инв. № 141-4330); (инв. № 141-4331); (инв. № 141-4332); (инв. № 141-4378); (инв. № 141-4379); (инв. № 141-4381), ворота в приготовительном цеху (инв. № 120-2111)	**1 542 204,40**	15 422,04
2	**Капитальное строение с инв. № 320/C-14327**, общей площадью **647,1 кв. м**, назначение – здание специализированное транспорта, наименование – **гараж на пять транспортных единиц с диспетчерской** (составные части и принадлежности: одноэтажное кирпично-панельное здание гаража на пять транспортных единиц с пристроенной двухэтажной кирпичной диспетчерской). **Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/9, гараж	**55 802,69**	2 790,14
3	**Капитальное строение с инв. № 320/C-14328**, общей площадью **692,4 кв. м**, назначение – здание специализированное транспорта, наименование – **гараж на восемь транспортных единиц** (составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание гаража на восемь транспортных единиц). **Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/10, гараж	**55 837,67**	2 791,89

Продавец: ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин, 247210, г. Жлобин, проезд Красный, 2. **Ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.** 8 (044) 797-88-07 заместитель директора по техническим вопросам – Гапанюков Виктор Владимирович. **Шаг аукциона устанавливается – 5 %.**

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин):** р/с BY76 BELB 3012 0114 1501 7022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, БИК BELBBY2X, УНП 400076541, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно с **9 апреля 2022 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 18 апреля 2022 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) %.

Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: произвести оплату услуг (вознаграждение) за организацию и проведение торгов, затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно срокам договора купли-продажи в течение **30 (тридцати) календарных дней** с момента подписания договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельобрреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

Предоставляется рассрочка платежа в соответствии с действующим законодательством РБ (для лота № 1).

Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 03.02.2022 г. № 22 (29644); от 29.05.2021 г. № 100 (29469).

Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».

Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 126-66-62, 8 (044) 599-18-16.

Па сутнасці

ТЭСТ НА ЛЮДСКАСЦЬ

Купель праваслаўнай веры — Кіеў. Вера гэтая яшчэ вельмі цяжкая і складаная. Цяжкая — як галгофскі крыж, складаная — быццам шлях з прэторыі на лобнае месца. І самае цяжкае на гэтым шляху — не страціць любоў.

Уся неабдымная, як сэрца Богачалавека, Беларусь — у сваёй міралюбнасці. Міралюбнасці, якая ў нашай ментальнасці з малаком маці, міралюбнасцю, якая ўпісана ў нашу рэчаіснасць сухімі літарамі дзяржаўных нормаў і правіл. Міралюбнасці, якая ў словах і мелодыі гімна. Але ж ці можна прымусіць любіць? «Не», — скажуць вам насельнікі топкіх палескіх мясцін, гаспадары прывабных мястэчак Панямоння, жыхары шырокага, як і іх сэрцы, Віцебска. У Слуцку — усё па-людску: падхопяць сакуны і запросяць у хату.

І ўся гэтая гасцінная Беларусь утульна ўмяшчаецца на плошчы чатырох вераваўзнанняў. Калі хто хоча насамрэч паразважаць пра дэмакратычныя свабоды і межы гуманізму — калі ласка, завітайце ў Іўе. Дэпутатаў Еўрапарламента, прававаабаронцаў з Бруселя і Вашынгтона трэба сюды вазіць на экскурсіі. Канешне, пасля азнаямлення з крэпасцю над Бугам, маўляў, там мы трымаліся, пасля ў Хатынь — там нас знішчалі. І ўжо тады — у Іўе — усе на плошчу, а вось што значыць беларускі свет. І абавязкова дашчамкаць паласаваць беларускімі каўбасамі ды вяндлінай. Не пластыкавымі, як у Еўропе, а натуральнымі. Краіна, як і прадукты, — сапраўдная.

Не збяднеем. Колькі ўжо дапамагалі і дапамагаем пакутнікам ад самых дэмакратычных «праменяў». Я спецыяльна гэтае слова напісаў так. На манер самай вядомай манахіні Беларусі — ігуменні Гаўрылы з Гродна. Бо менавіта яна з вялікім праваслаўным крыжом і падарункамі некалькі разоў наведвала дзяцей мусульманскага свету ў Бруэгас. Цяпер Брагін. Усюды былі руплівыя рукі беларускіх валанцёраў. Геаграфічныя назвы розныя — сэнс адзіны: чулае сэрца Беларусі.

Нездарма ж мудрыя хасіды адразу пасля ўкраінскіх падзей амаль пешшу накіраваліся ў Беларусь. Каля сотні чалавек. Што такое сотня? Калі ў Беларусі зараз прытулак знаходзяць тысячы ўкраінцаў. І навошта вылучаць асабліва хасідаў?

Вылучаю, бо ўжо такое было. Дэмакратычная Украіна, пераносячаная печыкам ад Нуланд і заклікамі да свабод, разрабавала зяцямі ваашынгтонскіх эліт, проста не пусціла да сябе хасідаў. Што-што, а псаваць святы і жыццё свайму насельніцтву кіеўскія сюзэрэны ўмеюць. За гэта іх і трымаюць. Добра адпрацоўваюць ганарар. Дарэчы, мара крывавых ідэолагаў Незалежнай спраўдзілася. Украіна пераствараецца ў сапраўдную імперыю. Імперыю мрояў. Вольшт кінематаграфічнай і гумарыстычнай сцэны спатрэбіўся. Карціну ўмеюць стварацъ. А рэчаіснасць іншая.

Нацыяналісты ў доты ператвараюць нават рэлігійныя ўстановы. Умань. Старадаўняе мястэчка. Менавіта сюды ішлі на свята хасіды. Украіна іх сустрэла ўзброеными парубкамі ў камуфляванай форме натаўскай афарбоўкі. Беларусь дала прытулак. Урок не вывучаны. Ізноў — Умань, сінагога. Украінская палітычная рэчаіснасць.

У базу ўмоўнага «Азова» ператварылі сінагогу. Спачатку нацыяналісты ставілі свае (ну як сваю, армейскі сэканд-хэнд ад заходніх дарадцаў) тэхніку сярод дзіцячых пляцовак — гэта, на жаль, стаўпы дэмакратыі не заўважаюць. У мяне адразу ўспыхнае ў памяці карціна з фільма «Брасцкая крэпасць». Але то былі вораг, а нашы жанчыны, дзеці і параненыя для землякоў Шылера — нелюдзі.

А хто тады ўкраінскія вайскоўцы і хто для ўкраінскіх вайскоўцаў дзеці Украіны? Жывы шчыт. Тады зразумела, за каго яны ваююць. За сваю ўладу альбо толькі за свае шкуры. Ну, у Вялікую Айчынную ў паліцаі і батальёны дырленвангераў разам з ідэйнымі забойцамі ішлі шкурнікі. Вось такая жудасная анталогія сучаснага ВСУ. Нічога святога.

Адсюль зразумела, чаму каля сцен Святагорскай лаўры нацыяналісты размяшчаюць сістэмы паветранай абароны, а сінагогу Умані ператвараюць у склад зброі. Можна казаць пра парушэнне міжнароднага і гуманітарнага права, нормаў маралі. Яны ўсе ўмяшчаліся ў скрыні і мяхі са зброяй. А самі «ваякі» не грэбуюць перамяшчацца ў аўтобусах з пазнакай «Дзеці».

Калі ранейшы нацыяналістаў параўноўвалі з нацыстамі, дык зараз гэты жудасны сінанімічны шэраг можна працягнуць. Цяпер украінскія нацыяналісты нагадваюць яшчэ і тэрарыстаў ІПЛА. Тыя разбуралі сусветныя хрысціянскія святыні, гэтыя — святыні сваёй краіны. Нічога святога.

Усё святое для ўкраінскага народа ўжо даўно прададзена на Захад, сапраўдная гісторыя растаптана абцасамі нацыскіх маршаў, а бясцэнны скарб абражаны рогатам гумарных пляцовак у прайм-тайм.

І хрысціяне, і ўдзеі ведаюць гэтыя прарочыя словы: «Гора тым, якія зло называюць дабром і дабро — злом, цемру шануюць святлом і святло — цемраю, горкае л

Сталічны ракурс

Ад цэнтра — да паўночна-заходніх ускраін...

...пралягае тэрыторыя Цэнтральнага раёна беларускай сталіцы. Ужо ў назве крыецца асаблівы сэнс, які адрознівае яго ад астатніх. Сэрца беларускай сталіцы, яе духоўны, культурны і гістарычны цэнтр. Тут бяруць свой пачатак старажытны Мінск, яго першыя будынкі, кірмашы і дарогі, менавіта тут з'яўляліся падзеі, аб'екты і людзі, якія сталі знакавымі ў лёсе вялікага горада і цэлай краіны.

Тэрыторыя, якую раён займае сёння, валодае багатым гістарычным мінулым. Пра гэта сведчаць старажытныя замчышчы, якім ужо больш за тысячу гадоў, а таксама разнастайнасць помнікаў гісторыі і архітэктуры, вытанчанасць і велічы якіх працягвае радаваць гараджан і турыстаў.

Аб мінулым, сённяшнім і будучыні гэтай муніцыпальнай адзінкі карэспандэнту «Звязды» расказаў кіраўнік адміністрацыі Цэнтральнага раёна Мінска Мікалай ПАЛЯКОЎ.

— Мікалай Аляксандравіч, Цэнтральны раён сталіцы ўтварыўся на тэрыторыі, якая раней уваходзіла ў склад Савецкага, ці былога Варашылаўскага. Ён адлічвае сваю гісторыю з 1969 года. Якія асноўныя вехі яго развіцця вы маглі б адзначыць?

— Гісторыя з'яўлення раёна непарыўна знітаваная з гісторыяй беларускай сталіцы. Першая згадка пра Мінск датуецца 1067 годам і звязаная з кровапралітнай бітвай на Нямізе. Прыкладна ў гэты ж час і быў заснаваны Мінск, хутчэй за ўсё, князем Усяславам, па загадзе якога з'явілася крэпасць на беразе рэкі Свіслач. Яна і стала першым будынкам на тэрыторыі сучаснага Цэнтральнага раёна.

У гады Вялікай Айчыннай вайны тут Мінск быў практычна разбураны. Большасць будынкаў адбудоўвалася нанова, і адраджэнне пачалося якраз з Цэнтральнага раёна.

Да 1969 года ў сталіцы пражывала ўжо амаль 900 тысяч чалавек. Існаваўшае адміністрацыйна-тэрытарыяльнае дзяленне не дазваляла эфектыўна вырашаць задачы па сацыяльна-эканамічным развіцці горада.

Адпаведнае рашэнне атрымала адпаведнае ўвасабленне ў Указе Вярхоўнага Савета БССР, які быў выдадзены 25 чэрвеня 1969 г., дзе адзначалася, што ўтварэнне двух новых раёнаў ажыццяўляецца за кошт разузбуйнення пяці існуючых на той час раёнаў — Ленінскага, Заводскага, Кастрычніцкага, Савецкага і Фрунзенскага. З гэтага моманту афіцыйна пачынаецца пункт адліку летапісу Цэнтральнага раёна сталіцы як паўнапраўнай часткі Мінска.

Пераўтвораны ў 1969 годзе, у сваіх сёлетніх межах Цэнтральны раён зацвердзіўся толькі з 1977 года. У пачатку XXI стагоддзя да Цэнтральнага раёна сталі адносіцца таксама і прылеглыя да Мінска вёскі Цнянка, Ржавец, Зара Рэвалюцыі, пасёлак Навінкі і Ждановічы.

— Чым Цэнтральны адрозніваецца ад іншых раёнаў сталіцы?

— Ён з'яўляецца адным з самых маладых у Мінску. Нягледзячы на сваю маладосць, у раёна ёсць чым ганарыцца. Аб гэтым сведчаць дасягненні ў розных сферах сацыяльна-эканамічнага развіцця.

Цэнтральны — не самы маленькі раён сталіцы, але і на тэрыторыі і на колькасці буйных прадпрыемстваў параўнальна меншы за Заводскі, дзе я працаваў раней. Аднак яго адрозніваюць высокая канцэнтрацыя аб'ектаў гандлю, індустрыі забаў, грамадскага харчавання, культуры і мастацтва, гісторыка-культурнай спадчыны (амаль палова ад агульнай колькасці па Мінску), мноства знакавых ва ўсіх сэнсах аб'ектаў рэспубліканскага значэння.

Раён з'яўляецца пляцоўкай для мерапрыемстваў рознага ўзроўню. На сутнасці, ён — візітная картка сталіцы, па вонкавым абліччы якой складаецца ўражанне аб Мінску і краіне ў цэлым у шматлікіх гасцей і турыстаў.

Раён адносіцца да ліку найбольш азяленených. На кожнага жыхара прыпадае па 50 кв. м зялёных насаджэнняў. Згодна з экалагічнай мадэллю горада, па тэрыторыі раёна праходзіць павятраны калідор 1-га парадку. У раёне размешчаны Рэспубліканскі біялагічны заказнік «Лебядзіны» — адзіная запаведная тэрыторыя Беларусі, якая ўваходзіць у гарадскія межы.

